# § 35. Гуманізм і Адраджэнне

УТОПІЯ АДРАДЖЭННЕ ГУМАНІЗМ
МІКЕЛАНДЖЭЛА БУАНАРОЦІ
ІЕРАНІМ БОСХ ЛЕАНАРДА ДА ВІНЧЫ
МІКАЛАЙ КАПЕРНІК
УІЛЬЯМ ШЭКСПІР РАФАЭЛЬ САНЦІ
ПІТАР БРЭЙГЕЛЬ СТАРЭЙШЫ

Эпоха вальнадумства

**1. Гуманізм як філасофская аснова Адраджэння.** Аднначасова са зменамі, што адбываліся ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці Еўропы, трансфармаваліся і самі людзі, іх уяўленні пра сябе і навакольны свет. На мяжы Сярэднявечча і Новага часу фарміраваўся новы тып чалавека — дзейны, практычны, упэўнены ў сабе і адначасова цікаўны. У процівагу царкоўнаму ўяўленню пра чалавека як пра нікчэмную і грахоўную істоту зарадзіўся новы светапогляд — *гуманізм* (ад лац. *humanus* — чалавечы).

Высветліце, каго і чаму называюць «айцом гуманізму».

Сутнасць гэтага светапогляду заключалася ў культе чалавека, глыбокім інтарэсе да яго асобы і прызнанні неабмежаваных магчымасцей чалавечага розуму. Еўрапейскія гуманісты ўзвялічвалі і нават «абагаўлялі» чалавека, ставячы ў цэнтр светабудовы яго, а не Бога. Чалавек для іх рабіўся багароўнай іс-

## СВЕТАПОГЛЯДНЫЯ АСНОВЫ ГУМАНІЗМУ

- Сцвярджэнне ідэалаў чалавека-творцы
- Адмаўленне царкоўна-феадальнай культуры
- Цікавасць да Антычнасці
- Правы чалавека на шчасце ў зямным жыцці
- Абвяшчэнне прыгажосці свету і чалавека
- Вера ў розум і рацыянальнае пазнанне

тотай, здольнай ствараць і пераўтвараць сябе дзякуючы сваім выбітным якасцям. Галоўнаю мэтай чалавечага існавання абвяшчаліся радасць і насалода жыццём, актыўныя дзеянні, накіраваныя на зацвярджэнне свайго месца ў свеце.

Гуманізм зрабіўся філасофскай асновай і ідэалогіяй еўрапейскага **Адраджэння (Рэнесансу)**, гістарычнага перыяду ідэйнага і культурнага развіцця Еўропы ў XIV–XVI стст. Гэты працэс абазначыў пераход ад сярэдневяковага светаўспрыняцця да больш свецкага, арыентаванага на чалавека і яго магчымасці. Гуманісты імкнуліся вярнуць да жыцця каштоўнасці Антычнасці, надаючы асаблівае значэнне адукацыі, мастацтву і навуцы, што спрыяла бурнаму развіццю культуры і грамадскай думкі таго часу.

**Адраджэнне (Рэнесанс)** — перыяд у гісторыі Еўропы XIV–XVI стст., які характарызуецца гуманістычным светапоглядам і свецкім характарам культуры.

## ЭТАПЫ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

| Ранняе | Высокае | Позняе |
|---|---|---|
| **XIV–XV стст.** | **Канец XV — першая палова XVI ст.** | **Другая палова XVI ст.** |
| Зараджэнне рэнесанснай культуры і яе пашырэнне ў Італіі | Найвышэйшы росквіт мастацтва і гуманістычнага светапогляду ў Еўропе | Сінтэз культуры Рэнесансу і Рэфармацыі ў Еўропе |

Як эканамічнае і палітычнае развіццё сярэдневяковай Італіі паспрыяла ўзнікненню Адраджэння менавіта на яе тэрыторыі?

## АСНОЎНЫЯ РЫСЫ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

- **Гуманізм** — абгрунтаванне самакаштоўнасці чалавека, яго правоў і свабод
- **Антрапацэнтрызм** — у цэнтры светабудовы стаіць чалавек
- **Эстэтызм** — вядучая роля мастацтва
- **Вальнадумства** — вызваленне ад дагматычнага сярэдневяковага мыслення

Якія рысы эпохі Адраджэння аб'ядноўваюць яе з культурай Антычнасці?

### Унутраныя супярэчнасці гуманізму

На працягу некалькіх стагоддзяў еўрапейцы выхоўваліся ў духу безумоўнага пакланення эпосе Адраджэння. Але не варта ідэалізаваць гуманізм, ігнараваць яго ўнутраныя супярэчнасці. Вызваляючы творчую асобу ад духоўнай улады каталіцкай царквы, гуманізм адначасова спараджаў пыху і веру ў бязмежныя здольнасці чалавечага розуму, спрыяў росту глыбокага індывідуалізму. Людзі, што абвясцілі гуманістычныя ідэі, часцяком паходзілі з вышэйшых гарадскіх саслоўяў, манастырскай і царкоўнай вярхушкі. Яны з пагардай ставіліся да сярэдніх і ніжэйшых сацыяльных груп, звярталіся пераважна да эліты, якая мела доступ да адукацыі.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Выказванні майстроў эпохі Адраджэння**

Ф. Петрарка: «Сапраўды высакародны чалавек не нараджаецца з вялікай душой, але сам сябе робіць такім дзівоснымі сваімі справамі».

У. Шэкспір: «Любоў не мае тлення й заняпаду».

Леанарда да Вінчы: «Дзе дух не водзіць рукой мастака, там няма мастацтва. Дзе думка не працуе разам з рукой, там няма мастака»; «Кожны чалавек заўсёды знаходзіцца ў цэнтры свету. Кожны — увасабленне свету, чалавек заўсёды цэнтр свету».

Мікеланджэла Буанароці:

«Не правда ли — примерам нет конца
Тому, как образ, в камне воплощенный,
Пленяет взор потомка восхищенный
И замыслом, и почерком резца?
Творенье может пережить творца:
Творец уйдет, природой побежденный,
Однако образ, им запечатленный,
Веками будет согревать сердца.
И я портретом в камне или в цвете,
Которым, к счастью, годы не опасны,
Наш век могу продлить, любовь моя, —
Пускай за гранью будущих столетий
Увидят все, как были вы прекрасны,
Как рядом с вами был ничтожен я».

*1. Якія якасці чалавека цаніліся ў эпоху Адраджэння?*
*2. У чым гуманісты бачылі значэнне мастацтва?*
*3. Пра якія рысы эпохі Адраджэння сведчаць прапанаваныя цытаты?*
*4. Якія думкі майстроў эпохі Адраджэння актуальныя і сёння? Растлумачце, чаму.*

Ідэалогія гуманізму мела двайную скіраванасць: антыфеадальную і антыплебейскую. І хоць супрацьстаянне царкве, дваранству і феадальным парадкам пераважала, нельга забывацца на тое, што гуманізм ігнараваў інтарэсы шырокіх пластоў насельніцтва.

**2. Чалавек як цэнтральная постаць у культуры Адраджэння.** У XVI ст. гуманістычны рух, які зарадзіўся ў Італіі, ахапіў амаль усе еўрапейскія краіны — ад Англіі і Нідэрландаў да Германіі і Швейцарыі, ад Пірэнейскага паўвострава да Польшчы і Венгрыі.

Успомніце, з творамі якіх аўтараў эпохі італьянскага Адраджэння вы знаёмыя. Якія з іх вас уразілі больш за ўсё?

Адным з найбольш вядомых прадстаўнікоў гэтага руху быў галандскі мысляр, вучоны і багаслоў Эразм Ратэрдамскі. У сваім знакамітым творы «Пахвала дурасці» ён выразіў рэзкую агіду да крывадушша і паразітычнага ладу жыцця каталіцкага духавенства. Вучоны заклікаў вярнуцца да сапраўднай хрысціянскай маралі, падкрэсліваў, што мэта чалавечага жыцця заключаецца ў імкненні да высокіх маральных законаў. Ён звязваў магчымасць стварэння дасканалага грамадства з удасканаленнем духоўнага жыцця людзей, лічыў, што менавіта шляхам унутранага пераўтварэння можна дасягнуць сацыяльных змен.

## Прадстаўнікі гуманістычнага руху



*Святое сямейства. Рафаэль Санці. 1506 г.*

Выдатныя жывапісцы XVI ст., такія як Рафаэль Санці, Мікеланджэла Буанароці і Тыцыян Вечэліа ў Італіі, Пітар Брэйгель Старэйшы ў Нідэрландах, Альбрэхт Дзюрэр і Ганс Гальбейн Малодшы ў Германіі, імкнуліся перадаць багацце чалавечага досведу і навакольнай рэчаіснасці.

Уільям Шэкспір у сваіх драмах звяртае ўвагу на чалавека як на найвышэйшы пачатак быцця, глыбока даследуе яго ўнутраны свет і складаныя эмоцыі. Жыццесцвярджальны дух працінае неўміручыя творы Франсуа Рабле «Гарганцюа і Пантагруэль» і Мігеля дэ Сервантэса «Дон Кіхот», якія адлюстроўваюць імкненне да свабоды і пошуку сэнсу жыцця.

Даведайцеся, каго і чаму называюць «тытанамі Адраджэння».

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*1. Параўнайце дзве выявы і вызначце, якая створана ў Сярэднія вякі, а якая — мастаком Адраджэння, вылучыўшы адметныя рысы жывапісу кожнай з эпох.*

*2. Як прадстаўленыя творы дапамагаюць нам зразумець эпоху, у якую яны былі створаны?*

*3. У чым выразілася «рэвалюцыя» ў мастацтве ў эпоху Адраджэння? Абгрунтуйце свой адказ.*

А



Б



**Ідэя моцнай дзяржаўнай улады**

**3. Сацыяльна-палітычная думка.** Паварот Адраджэння да чалавека аказаў значны ўплыў на сацыяльныя і палітычныя тэорыі. Гуманісты адпрэчвалі ўяўленне пра боскае ўмяшанне ў справы чалавецтва, сцвярджаючы, што палітыка вызначаецца не Богам або мараллю, а практычнымі інтарэсамі і патрэбамі людзей. У гэты час быў зроблены важны крок у разуменні дзяржавы як сілы, якая бароніць інтарэсы пэўных пластоў насельніцтва.

Як вы разумееце значэнне слоў і выразаў «утопія», «донкіхоцтва», «барацьба з ветракамі»?

Зарадзілася ідэя моцнай дзяржаўнай улады (абсалютызму), здольнай пераадолець унутраную раз’яднанасць грамадства і супрацьстаяць дыктату Рымскай каталіцкай царквы. Вядомымі прадстаўнікамі тэорыі абсалютызму выступілі італьянец Нікола Макіявелі і француз Жан Бадэн. Абодва вучоныя выступалі за стварэнне цэнтралізаванай дзяржавы на чале з абсалютным правіцелем. Яны лічылі, што толькі такая

дзяржава магла аб'яднаць Італію, якую раздзіралі войны ў канцы XV — пачатку XVI ст., а Францыю вывесці з хаосу рэлігійных канфліктаў.

**Утапічныя вучэнні**

Адначасова з гэтым з'яўляліся тэорыі, якія крытыкавалі сацыяльную няроўнасць, хцівасць і бездухоўнасць. Спрэчкі пра дасканалае ўладкаванне грамадства і дзяржавы прывялі да з'яўлення ўтапічных вучэнняў, якія стваралі ідэал грамадскага ладу, заснаванага на калектыўнай уласнасці і ўсеагульнай абавязковай працы. Сярод выбітных утапістаў XVI ст. можна вылучыць англічаніна Томаса Мора і італьянца Тамаза Кампанелу.

### «УТОПІЯ»



*Томас Мор. XVI ст.*

- адсутнічаюць прыватная ўласнасць, грошы і войны
- грамадзяне працуюць па 6 гадзін на дзень, што ў вольны час дазваляе ім займацца мастацтвам і навукай
- людзі жывуць у дастатку, а матэрыяльныя даброты размяркоўваюцца паводле патрэб

### «ГОРАД СОНЦА»

- адсутнічаюць прыватная ўласнасць і эксплуатацыя чалавека
- праца становіцца абавязковым, але радасным заняткам
- на чале дзяржавы стаіць жрэц, які кіруе саветам мудрацоў
- адукацыя і выхаванне маюць першараднае значэнне



*Тамаза Кампанела. XVI ст.*

**4. Фарміраванне навуковай карціны свету.** Фарміраванне новай карціны свету стала магчымым дзякуючы значным навуковым і тэхнічным адкрыццям. Вялікія геаграфічныя адкрыцці пашырылі далягляды еўрапейцаў і змянілі іх уяўленні пра Сусвет.

Успомніце важныя тэхнічныя вынаходствы і тэхналагічныя дасягненні XIV–XV стст.

Вучоныя Рэнесансу акцэнтавалі ўвагу на вопыце, вывучэнні прыроды і эксперыментальным метадзе. Эпахальныя адкрыцці звязаныя з імёнамі такіх выдатных мысляроў, як Леанарда да Вінчы, Мікалай Капернік, Джардана Бруна і Галілея Галілей.

## НАВУКОВЫЯ АДКРЫЦЦІ

| Мікалай Капернік | Джардана Бруна | Галілеа Галілей |
|---|---|---|
| стварыў вучэнне аб абарачэнні Зямлі вакол Сонца і вярчэнні вакол сваёй восі | стварыў вучэнне аб бязмернасці, бясконцасці і вечнасці Сусвету | пацвердзіў геліяцэнтрычную тэорыю Каперніка |

Пашырце інфармацыю аб навуковых дасягненнях выдатных мысляроў Адраджэння. Якія адкрыцці гэтай эпохі заклалі асновы сучаснай навукі?

Эпоха Адраджэння стала новым этапам у развіцці еўрапейскай цывілізацыі, адпрэчваючы раней бясспрэчныя царкоўныя дагматы і аўтарытэты, адкрываючы шлях для развіцця прыродазнаўства і прыкладной навукі. Гэтая эпоха падарыла свету выдатныя дасягненні ў мастацтве, літаратуры, архітэктуры і горадабудаўніцтве. Аднак не варта забывацца, што адначасова з Адраджэннем пачалася эпоха каланіяльнага рабавання, гандлю рабамі і станаўлення ўлады грошай, што прывяло да з’яўлення духу нажывы сярод еўрапейцаў.

**Гуманістычныя ідэі на тэрыторыі Усходняй Еўропы**

**5. Уплыў гуманістычных ідэй на грамадска-палітычную думку Усходняй Еўропы.** У другой палове XV — XVI ст. гуманістычныя ідэі пачалі пранікаць на тэрыторыю Усходняй Еўропы. У гэты перыяд пашырыліся міжнародныя кантакты ВКЛ і Расійскай дзяржавы, вырасла колькасць гарадскога насельніцтва, аформіліся дзяржаўныя ўстановы, павялічылася патрэба грамадства ў адукаваных людзях. Вырасла цікавасць да ведаў і заходнееўрапейскага досведу, назапашанага ў навуцы, архітэктуры і выяўленчым мастацтве. Узнікла патрэба ў кнігадрукаванні, складанні геаграфічных картаў, слоўні-

каў замежных моў. Рускія публіцысты добра ведалі творы антычных аўтараў і часта спасылаліся на іх.

Пасля падзення Візантыйскай імперыі асаблівую актуальнасць атрымалі ідэі, звязаныя з абаронай праваслаўя. У другой палове XVI ст. на ўкраінскіх землях Канстанцін Астрожскі ў сваім маёнтку заснаваў Астрожскую славяна-грэка-лацінскую акадэмію — вышэйшую праваслаўную навучальную ўстанову, якая была арганізавана на ўзор універсітэтаў Заходняй Еўропы. У 1581 г. тут была апублікавана Астрожская Біблія — першае поўнае выданне Бібліі на царкоўнаславянскай мове. У 1663 г. гэтае выданне практычна без змен было перадрукавана ў Маскве і з'яўлялася афіцыйнай рэдакцыяй славянскай Бібліі да 1740-х гг.



*Астрожская Біблія. 1581 г.*

У XVI ст. у рускай грамадска-палітычнай думцы пачалі праяўляцца рысы гуманізму, умацоўвалася ідэя самакаштоўнасці чалавека. Абмеркаванне дадзенага пытання можна знайсці ў духоўнай літаратуры Расійскай дзяржавы. Тэма «самаўладдзя» чалавека прысутнічала і ў перапісцы першага расійскага цара Івана IV (1533–1584 гг.) з князем Андрэем Курбскім, які збег у ВКЛ.

Актывізаваліся ерэтычныя рухі, накіраваныя супраць афіцыйнай царквы. Яны былі звязаныя з пошукам людзьмі духоўнай ісціны і сацыяльнай справядлівасці. Кола асоб, якія ўдзельнічалі ў дыскусіях пра свабоду чалавека, было вельмі вузкае, уключала зусім невялікую частку гарадскога насельніцтва. Царква ў саюзе з дзяржавай падаўляла ерасі і рэфарматарскія плыні ў духоўнай культуры.

**6. Культура Усходу ў XIV–XVI стст.** Культура Усходу ў XIV–XVI стст. дасягнула значных поспехаў. У галіне мастацтва яна не саступала еўрапейскай. У адрозненне ад яе развівалася ў рэчышчы традыцыі і ў згодзе з рэлігіяй, не змяняючы светапогляду людзей, іх уяўленняў пра сябе, грамадства і навакольны свет.



Абу-л Фазл Аламі падносіць падышаху Акбару кнігу «Акбар-намэ». Мініяцюра. 1596–1597 гг.

У Асманскай імперыі, якая дасягнула піку свайго развіцця ў XVI ст., назіраўся сінтэз разнастайных культур. Туркі-асманы актыўна запазычвалі элементы візантыйскай, арабскай і персідскай культур, што прывяло да стварэння ўнікальнага стылю ў архітэктуры, жывапісе і літаратуры. Славутая мячэць Сулейманіе ў Стамбуле, пабудаваная архітэктарам Сінанам, з'яўляецца яскравым прыкладам гэтага архітэктурнага сінтэзу. Літаратуру таго часу прадстаўлялі выбітныя паэты, такія як Асман Нефі, Мухамед Фізулі і Махмуд Бакы. Нефі, майстар хвалебнай оды і сатыры, выкрывальнік феадальных вярхоў, быў пакараны смерцю па загадзе султана. Фізулі, аўтар паэмы «Лейлі і Меджнун», пісаў на роднай азербайджанскай, на арабскай і персідскай мовах. Бакы быў прызнаны пры двары як «султан паэтаў». Ён, як еўрапейскія гуманісты, заклікаў цешыцца радасцямі хуткаплыннага быцця.

У Індыі пад уладаю Вялікіх Маголаў росквіт культуры пачынаецца ў другой палове XVI ст. Магольскія ўладары падтрымлівалі мастацтва, архітэктуру і літаратуру. Імператар Акбар перакладаў творы з персідскай на санскрыт і з санскрыту на персідскую. У перыяд яго праўлення была створана славутая школа магольскай мініяцюры. Шэдэўры магольскай мініяцюры вылучаліся яркімі фарбамі і вытанчанымі дэталямі, гарманічна спалучалі індыйскія і персідскія мастацкія традыцыі.

У Кітаі дынастыя Мін таксама пакінула яскравы след у культуры. Гэты перыяд быў часам вялікіх адкрыццяў і гандлёвых экспедыцый, у тым ліку знакамітых марскіх экспедыцый адмірала Чжэн Хэ. У мастацтве пераважалі жывапіс і кераміка, якія славіліся высокім узроўнем майстэрства. Мінская кераміка, асабліва фарфор, зрабілася вядомай ва ўсім свеце. У гэты ж перыяд былі створаны выбітныя раманы кітайскай літаратуры: «Траяцарства» (XIV ст.), «Рачныя затокі» (каля XV ст.), «Падарожжа на Захад» (XVI ст.), перакладзеныя на рускую мову.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, высветліце, у якія краіны адмірал Чжэн Хэ арганізаваў марскія экспедыцыі.

*Эпоха Адраджэння была пераходным перыядам паміж хрысціянскім Сярэднявеччам і напоўненым духам перамен Новым часам. Адраджэнне стала адпраўным пунктам фарміравання новага светапогляду, новых падыходаў у палітыцы і адукацыі, а таксама стварэння свецкай навукі і культуры. У другой палове XV–XVI ст. гуманістычныя ідэі пачалі пранікаць на тэрыторыю Усходняй Еўропы. У развіцці культуры ўсходніх цывілізацый захоўвалі свой уплыў традыцыі і рэлігійныя нормы.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
| --- | --- |
| XIV–XVI стст. — эпоха Адраджэння ў гісторыі Еўропы | Першая палова XVI ст. — пачатак эпохі Адраджэння |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце перадумовы і асноўныя рысы эпохі Адраджэння.
2. Светапоглядной асновай эпохі Адраджэння быў гуманізм. Сфармулюйце яго асноўныя ідэі. Як яны рэалізоўваліся ў розных галінах культуры? Ці з'яўляюцца актуальнымі ў сучасным свеце?
3. Якія дасягненні эпохі Адраджэння вы лічыце найбольш значнымі і чаму? У чым вы бачыце гістарычнае значэнне эпохі Адраджэння?
4. Уявіце, што вам трэба стварыць музейную экспазіцыю «Чалавек эпохі Адраджэння». Якія экспанаты, што адлюстроўваюць дадзеную тэму, вы ўключылі б у яе? Абгрунтуйце свой выбар.
5. Ці згодныя вы са сцверджаннем, што выяўленчае мастацтва ў Асманскай імперыі ў XV–XVI стст., як і ў іншых краінах мусульманскага свету, амаль не развівалася, паколькі ісламская рэлігія строга забараняла выяўляць людзей? Свой адказ аргументуйце.